Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**
вул. К.Маркса, 31, г.Мінск, 220030
тэл. (017) 222-34-21
факс (017)227-65-83
E-mail: phyl@bsu.by

Министерство образования Республики Беларусь
**БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ**

**ФИЛОЛОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ**
ул. К.Маркса, 31, г.Минск, 220030
тел. (017) 222-34-21
факс (017)227-65-83
E-mail: phyl@bsu.by

**Шаноўныя калегі!**

Ад імя ўсіх супрацоўнікаў і студэнтаў філалагічнага факультэта БДУ сардэчна віншую Вас з 65-гадовым Юбілеем кафедры!

Кафедру беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта і філалагічны факультэт БДУ аб'ядноўваюць даўнія навуковыя сувязі, агульныя даследчыцкія і адукацыйныя мэты: распрацоўка актуальных навуковых напрамкаў у галіне беларускай мовы, літаратуры, гісторыі і культуры, падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў-беларусазнаўцаў, папулярызацыя ведаў пра Беларусь.

Дазвольце з нагоды Юбілею Кафедры выказаць словы шчырай удзячнасці ўсім былым і сённяшнім яе супрацоўнікам за шматгадовую плённую працу на карысць беларусістыкі. Імёны і навуковы ўнёсак польскіх калег з кафедры беларусістыкі добра вядомы і запатрабаваны ў Беларусі. Мы з вялікім шанаваннем узгадваем заснавальніцу кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта прафесара Антаніну Абрэмбскую-Яблонскую, колішнюю супрацоўніцу кафедры доктара Тэрэзу Ясінскую-Соха. Перадаем словы нашай павагі і ўдзячнасці паважаным прафесарам Эльжбеце Смулковай, Ніне Баршчэўскай, Аляксандру Баршчэўскаму, Мікалаю Цімашуку. Віншаванні і найлепшыя пажаданні дасылаем усім супрацоўнікам кафедры беларусістыкі, якія плённа працуюць на яе развіццё і ўдасканаленне ў сучаснасці: шаноўным Міколу Хаўстовічу, Радаславу Калету, Андрэю Масквіну, Катажыне Дрозд, Вользе Трацяк, Ганне Бераніцы Сівірскай, Ангеле Эспінозе Руіз, Ірыне Агеевай, Марылі Хаўстовіч.

Зычым Вам працоўных поспехаў, здзяйснення задуманага, творчага натхнення, здароўя і шчасця!

Дэкан філалагічнага факультэта
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

С. А. Важнік